На равеснікаў паглядзець...

ЗА МІР І ДРУЖБУ!

Рэкорды маладзёжнага фэсту розных гадоў

Роўна 60 гадоў таму ў СССР стартаваў самы масавы Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў. Ён быў шосты па ліку і праходзіў у Маскве. На форум з'ехаліся 34 тысячы ўдзельнікаў з усёй планеты. Менавіта дзякуючы гэтай падзеі краіна атрымала стадыён «Лужнікі», аўтобусы «Ікарус» і знакаміты лозунг «Мір, дружба, жуйка». Наладжваць дыпламатычныя сувязі і тварыць мір ва ўсім свеце ў Маскву прыехала больш за 30 тысяч замежнікаў. Для камфорту ўдзельнікаў у дні фестывалю ў сталіцы адступілі ад жорсткіх рамак. На вуліцах у адкрытую гучаў джаз, а ў некаторых месцах можна было без боязі пачаставацца нябачанай да гэтага кока-колай.

А першы сусветны фестываль моладзі і студэнтаў адбыўся ў 1947 годзе ў Празе і стаў самым працяглым у гісторыі фестывальнага руху — ён доўжыўся амаль шэсць тыдняў! У ім прынялі ўдзел 17 тысяч чалавек з 71 краіны. Затым былі фестывалі ў сталіцах краін Усходняй Еўропы: Будапешце (1949), Берліне (1951), Бухарэсце (1953) і Варшаве (1955). Першыя фэсты праводзіліся з перыядычнасцю раз у два гады. У канцы 40-х — пачатку 50-х гадоў назіраўся рост колькасці ўдзельнікаў і колькасці краін, якія яны прадстаўлялі.

VI Сусветны фестываль 1957 года, які прайшоў у Маскве, стаў самым масавым за ўсю гісторыю фестывальнага руху. У ім бралі ўдзел 34 тысячы чалавек. Яны прадстаўлялі 131 краіну свету, што ў той час стала рэкордам. На наступных фестывалях колькасць удзельнікаў была меншай, аднак рэкорд па ліку краін, прадстаўленых на фестывалі, быў пабіты. Акрамя таго, Масква стала самай паўночнай кропкай правядзення фестывалю за ўсю яго гісторыю.

У 1959 годзе VII фэст моладзі і студэнтаў упершыню прайшоў у капіталістычнай краіне, у сталіцы Аўстрыі — Вене. Затым фестываль прымалі Хельсінкі (1962) і Сафія (1968).

На фестывалях у сяброўскай абстаноўцы маглі мець стасункі дэлегаты з краін капіталізму і сацыялістычнага лагера, у тым ліку тых, якія ўступілі ў ваеннае супрацьстаянне. Напрыклад, з ЗША і Паўночнай Карэі. Але ў 1970-х гадах фестывальны рух набыў ярка выражаную пракамуністычную афарбоўку.

У 1978 годзе XI фестываль упершыню быў праведзены на Амерыканскім кантыненце — у сталіцы Кубы Гаване. Фестываль упершыню прайшоў на беразе мора. Сталіца Вострава Свабоды — самая заходняя кропка правядзення фестываляў.

На прайшоўшым у Маскве ў 1985 годзе XII Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў імкнуліся мінімізаваць кантакты замежнікаў з выпадковымі, неправеранымі людзьмі. Фестываль, задуманы для свабодных стасункаў, стаў моцна фармалізаваным мерапрыемствам.

У 1989 годзе XIII Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў пабіў два рэкорды. Па-першае, ён упершыню прайшоў у Азіі. Прымала гасцей фестывалю сталіца КНДР — Пхеньян. Па-другое, мерапрыемства стала самым прадстаўнічым — у ім удзельнічалі госці са 177 краін свету. Спецыяльна для яго быў пабудаваны грандыёзны стадыён Першага мая на 150 тысяч чалавек, які і дагэтуль застаецца самым умяшчальным стадыёнам на планеце. Пхеньян стаў самым усходнім месцам правядзення фестывалю за ўсю яго гісторыю. У канцы 1980-х — пачатку 1990-х гадоў паміж фестывалямі адбыўся самы працяглы перапынак — каля васьмі гадоў. Фестывальны рух быў адроджаны ў 1997 годзе — чарговы маладзёжны фэст адбыўся ў Гаване.

У 2001 годзе ў Алжыры прайшоў XV фестываль. Гэты быў першы фестываль на Афрыканскім кантыненце. У ім прыняла ўдзел найменшая колькасць удзельнікаў за ўсю гісторыю маладзёжнага руху — 6,5 тысячы чалавек.

XVI Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў адбыўся ў Каракасе (Венесуэла) у 2005 годзе з удзелам 17 тысяч чалавек са 144 краін.

XVII фестываль паспяхова прайшоў у Прэторыі, ПАР, 13—21 снежня 2010 года. Месца правядзення стала самым паўднёвым за ўсю гісторыю фестывальнага руху.

XVIII фестываль у Эквадоры сабраў у снежні 2013 года больш за 8 тысяч удзельнікаў з 88 краін. Фестываль праходзіў у экзатычных умовах: у высакагорным раёне на пляцоўцы былога аэрадрома сталіцы рэспублікі Кіта, на вышыні каля трох тысяч метраў над узроўнем мора. Такім чынам, гэта быў самы высакагорны фестываль.

XIX Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў (на які паедзе беларуская дэлегацыя, у складзе якой і спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Ілья Крыжэвіч) адбудзецца ў Расіі — 15 кастрычніка яго прымае Сочы... Ужо цяпер можна казаць, што ён паставіў рэкорд у фестывальнай гісторыі па колькасці нацыянальных дэлегацый удзельнікаў, якіх будзе больш за 180.

Таксама варта завастрыць увагу на героях цырымоніі адкрыцця. Прадстаўленне будзе пабудавана вакол рэальных гісторый людзей, якія змяняюць жыццё да лепшага: у іх ліку Афроз Шах з Індыі, які за 86 тыдняў прыбраў 5,4 тоны смецця з пляжа ў Мумбаі; Раман Гек з Расіі, які за два гады пабудаваў школу ў Непале; заснавальнікі дабрачыннага фонду падтрымкі дзяцей з асаблівасцямі развіцця «Я ёсць!» Ягор Бяроеў і Ксенія Алфёрава і іншыя.

І, вядома, адной з адметных рыс XIX Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў будзе валанцёрскі корпус, які аб'яднаў 5 тысяч добраахвотнікаў з 67 краін і стаў самым масавым у свеце сярод неспартыўных мерапрыемстваў.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

...І сябе паказаць!

ЗДЗІЎЛЯЦЬ, УРАЖВАЦЬ, ЗАПРАШАЦЬ

заклікана выстава-прэзентацыя Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі

Падчас Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Сочы маладзёжная дэлегацыя БРСМ арганізуе маштабную выставу, на якой будуць прэзентаваны дасягненні Беларусі ў самых розных сферах. «Хлопцы і дзяўчаты запросяць равеснікаў з іншых дзяржаў наведаць нашу краіну, у тым ліку па бязвізавым рэжыме. Мы хочам, каб як мага больш маладых людзей з розных куткоў свету ўбачылі ўнікальныя аб'екты культурна-гістарычнай спадчыны, бліжэй даведаліся пра беларусаў, пабывалі ў сталіцы на II Еўрапейскіх гульнях 2019 года, чэмпіянаце свету па хакеі, які Беларусь у 2021 годзе будзе прымаць разам з Латвіяй», — сказаў перад ад'ездам дэлегацыі ў Сочы першы сакратар Мінскага гарадскога камітэта БРСМ Сяргей КЛІШЭВІЧ. Чым плануюць здзіўляць равеснікаў з іншых краін нашы маладыя суайчыннікі?

На выставе ў блоку «Беларусь — краіна натхнення» можна будзе азнаёміцца з «Азбукай беларускага арнаменту». На мальбертах размесцяць такія з іх, як «Маладосць», «Узбагачэнне», «Квітнеючая зямля», «Чысціня», «Агонь». Дзяўчаты-актывісткі Саюза моладзі ў вышыванках з яблыкамі прапануюць усім ахвотным дамаляваць арнамент. На гатовы варыянт паставяць пячатку з картай Беларусі і хэштэгам #ChooseBelarus, перавяжуць чырвонай ці зялёнай стужкай з біркай, на якой тлумачыцца значэнне арнаменту, і ўручаць наведвальніку выставы ў якасці сувеніра.

Тут жа ў фотазоне «Беларусь старажытная» ахвотныя мужчыны змогуць апрануць шляхетны касцюм і сфатаграфавацца з «паненкай» — дзяўчынай у нашым нацыянальным строі. Усім наведвальнікам дадуць візітку са спасылкай на «воблака», куды кожны вечар будуць загружаць фатаграфіі. А ў фотазоне #ВыбіраемБеларусь прапануюць сфатаграфавацца з аднайменнымі хэштэгамі на рускай, англійскай мовах і на лацініцы, а таксама паставіць пячатку на руцэ #ChooseBelarus. Можна будзе таксама зрабіць здымак на фоне сцяга Рэспублікі Беларусь і выставы дасягненняў краіны. Зноў жа, фатаграфіі кожны вечар будуць загружацца на «воблака».

Бодзіарт «Малюем па-беларуску» прапануе наведвальнікам нанесці на адкрытыя ўчасткі цела беларускі арнамент і іншыя элементы беларускай дзяржаўнасці. А на пляцоўцы «Беларускія гасцінцы» ўсе ахвотныя атрымаюць яблык як сімвал ураджаю намаганняў і дасягненняў моладзі краіны, а таксама стужку на руку з беларускім арнаментам.

На пляцоўцы «100 ідэй для Беларусі» будуць прадстаўлены праекты ў сферы IT-тэхналогій, напрыклад, фізічны калькулятар, пальчатка-трэнажор і многія іншыя.

Наведвальнікам прэзентацыі «Студэнцкія атрады» будзе прапанавана пераапрануцца ў студатрадаўскую форму, узяць у руку кельму і сфатаграфавацца на памяць. Вітрына «Піянерская скарбонка» ў блоку «Піянерыя — краіна сяброўства і дабра» заклікана ў нагляднай форме пазнаёміць з дасягненнямі Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі. Круглы стол будзе афармлены пад «майстэрню піянерскіх спраў», тут можна прышыць манжэты з тасьмы з беларускім арнаментам.

Конкурс па зборы пазлаў «Еўрагульні-2019» прапануюць наведвальнікам выставачнага блока «Добрае Сэрца». Удзельнікі будуць збіраць на хуткасць пазлы з аб'ектамі II Еўрапейскіх гульняў 2019 года. Пераможца атрымае сувенір. Таксама дзяўчына-валанцёр прапануе вырабіць арыгамі-фігурку ў форме сімвала валанцёрскага руху «Добрае Сэрца» і прымацаваць яе да адзення. Тут жа на пляцоўцы «Рэкорды Беларусі» можна будзе зрабіць рывок гірай (16, 24 і 32 кілаграмы). Вынік агульнай вагі будзе складацца па колькасці пад'ёмаў усіх удзельнікаў цягам усіх дзён выставы — з мэтай устанаўлення міжнароднага рэкорду фестывалю.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

У духу часу

«Ключы» да новай генерацыі

На маючым адбыцца фестывалі ў Сочы ўсё будзе адбывацца з выкарыстаннем сучасных «фішак».

Для прыкладу, кампанія «Мобайк» прадставіць на пляцоўцы фестывалю першы ў Расіі праект «Свабодны веласіпед». У яго аснове — сэрвіс для перамяшчэння ў гарадскім асяроддзі без выкарыстання класічных парковачных станцый, па аналогіі з каршэрынгам. Гэта значыць, што ўдзельнікі і госці мерапрыемства змогуць бесперашкодна выбраць адзін з 1000 веласіпедаў на Mobee-стаянцы ў Алімпійскім парку. Разблакаваць яго можна будзе з дапамогай спецыяльнай мабільнай праграмы, счытаўшы смартфонам унікальны QR-код Акрамя функцыі «ключ», праграма таксама пакажа, дзе паблізу ад вас знаходзяцца свабодныя веласіпеды, маршрут вашых перасоўванняў, час, дыстанцыю паездкі і нават... выдаткаваныя калорыі.

Паколькі 2017 год аб'яўлены ў Расіі годам экалогіі, арганізатары спадзяюцца абысціся на фестывалі ўвогуле без папяровых носьбітаў, выкарыстоўваючы толькі гаджэты і лічбавыя прылады, што для сучаснай моладзі, уласна кажучы, зусім не праблема. Адзін з інавацыйных праектаў быў распрацаваны спецыяльна да фестывалю. Па форме гэта мабільная праграма, а па змесце — сінтэз месенджара з элементамі дапоўненай рэальнасці і асабістага кабінета, у якім можна будзе запісацца на адно са шматлікіх мерапрыемстваў фестывалю.

На стэндах выставачнага праекта YOUTH EXPO будуць ладзіцца віртуальныя экскурсіі. Любы ахвотны зможа азнаёміцца з нацыянальнымі асаблівасцямі рэгіёнаў Расіі і замежных краін, перспектыўнымі маладзёжнымі праектамі, дасягненнямі навукі і культуры. Удзельнікі змогуць выбраць адну са шматлікіх віртуальных экскурсій і проста з выставачнай залы перанесціся, напрыклад, на Чукотку.

Упершыню ў гісторыі фестывальнага руху ў грандыёзным маладзёжным свяце будзе задзейнічана ўся краіна. У рамках форуму запланавана рэгіянальная праграма: больш як 1,5 тысячы замежных удзельнікаў у першыя тры дні свайго знаходжання ў Расіі наведаюць 15 розных рэгіёнаў — ад Калінінграда да Уладзівастока.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*